А. У. УНУЧАК

# УШАНАВАННЕ ПАМЯЦІ КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА НА СВІСЛАЧЧЫНЕ (1958–1989 гг.)

У 1958 г. споўнілася 120 гадоў з дня нараджэння Кастуся Каліноўскага (1838–1864). Угодкі К. Каліноўскага рэгулярна адзначаліся ў БССР пачынаючы з 1924 г., калі споўнілася 60 год з часу ягонай смерці [5; 14]. Адзначэнне круглых дат мела вялікую ролю ў фарміраванні вобразу К. Каліноўскага, папулярызацыі яго асобы і стымуляванні навуковых даследаванняў жыцця і дзейнасці кіраўніка паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі і Літве. Адметнасцю адзначэння юбілеяў К. Каліноўскага ў пасляваенны час было тое, што важныя мерапрыемствы і ўрачыстасці праходзілі на радзіме кіраўніка паўстання – на Свіслаччыне.

9 студзеня 1956 г. пісьменнік, сакратар Гродзенскага абласнога аб'яднання Саюза пісьменнікаў БССР Аляксей Карпюк звярнуўся з лістом да сакратара ЦК КПБ Цімафея Гарбунова, дзе сярод іншага пісаў: «Да гэтага часу ў нас на Гродзеншчыне не ўшанавана памяць выдатных дзеячаў беларускай культуры: Кастуся Каліноўскага, Алаізы Пашкевіч (Цёткі), Багдановіча, Карскага і іншых. Як гэта не дзіўна, але ўсё-ж нават такому выдатнаму нацыянальнаму герою, як Каліноўскаму, якога добра ведае ўвесь СССР, на яго радзіме ў Свіслачы няма нават мемарыяльнай дошкі… Прыведзеныя мной факты вызываюць у некаторай часткі мясцовай беспартыйнай інтэлігенцыі розныя крыватолкі і не зусім здаровыя гутаркі аб мнімым ігнараванні беларускай культуры, на што я, як камуніст, лічу сваім абавязкам звярнуць Вашу ўвагу.

Каб пакласці канец усялякім гутаркам, а таксама каб выказаць належнае выдатным людзям нашага народа, на маю думку, першым чынам трэба зрабіць наступнае.

Па Каліноўскаму: 1. Прысвоіць Гродзенскаму педагагічнаму інстытуту імя Кастуся Каліноўскага (ка дню 16 лютага, калі Каліноўскі быў павешаны)[1]; 2. Свіслацкую сярэднюю школу назваць імем Каліноўскага; 3. На месцы былой гімназіі, дзе ву-

[1] Тут А. Карпюк відавочна зрабіў памылку, – К. Каліноўскі быў павешаны 10 (22) сакавіка 1864 г. – *А. У.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чыўся Каліноўскі, устанавіць мемарыяльную дошку; 4. Цэнтральную вуліцу Свіслачы назваць імем Кастуся Каліноўскага» [12]. Магчыма, што гэты зварот так і застаўся б партыйных архівах, але ў лютым 1956 г. адбыўся XX з’езд КПСС, на якім быў зачытаны даклад першага сакратара ЦК КПСС Мікіты Хрушчова «Аб кульце асобы і яго наступствах», у якім выкрываліся і асуджаліся некаторыя злачынствы Сталіна. Пасля шырокага знаёмства са зместам «антысталінскага» даклада М. Хрушчова пачалася так званая адліга, што дазволіла больш свабодна гаварыць аб праблемах развіцця беларускай культуры і гістарычнай памяці.

На гэтым фоне ў 1957 г. праграма ўшанавання памяці К. Каліноўскага была падтрымана Ц. Гарбуновым, які падпісаў рэкамендацыю Гродзенскаму абкаму КПБ выкарыстаць прапановы А. Карпюка. 15 студзеня 1957 г. з ЦК КПБ на імя сакратара Гродзенскага абкама КПБ Баранава прыйшоў адпаведны ліст. Ц. Гарбуноў пісаў: «Накіроўваю Вам на разгляд просьбу намесніка Гродзенскага літаратурнага абласнога аб’яднання тав. Карпюка аб увекавечанні памяці выдатных дзеячаў беларускай культуры: Кастуся Каліноўскага, Алаізы Пашкевіч (Цёткі), Багдановіча, Карскага. Думаю, што прапанова, якая зыходзіць ад пісьменнікаў заслугоўвае ўвагі. Тое, што прапаноўвае тав. Карпюк, падтрымліваецца Праўленнем Саюза пісьменнікаў Беларускай ССР.

Я са свайго боку лічу, што гэта мерапрыемства трэба было б правесці, у гэтым ёсць вялікі сэнс. Можна было б прысвоіць Гродзенскаму педагагічнаму інстытуту імя Каліноўскага, на месцы былой гімназіі, дзе вучыўся Каліноўскі, устанавіць мемарыяльную дошку, адну з вуліц Свіслачы назваць імем Каліноўскага» [12].

У студзені 1958 г. Гродзенскі абкам КПБ і аблвыканкам прынялі рашэнне арганізаваць у Свіслачы музей К. Каліноўскага, інфармацыя пра гэта была надрукавана ў органе Саюза пісьменнікаў БССР газеце «Літаратура і мастацтва» [6, с. 217]. У тым самым годзе газета «Літаратуры і мастацтва» змясціла яшчэ адзін артыкул літаратара І. Клаза [7]. Паводле аўтара, будынак прагімназіі ў Свіслачы, дзе вучыўся К. Каліноўскі, «разбурылі фашысцкія захопнікі», якія імкнуліся знішчыць памяць пра нацыянальнага героя Беларусі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У лістападзе 1958 г. у Свіслачы ўрачыста ўсталяваны помнік К. Каліноўскаму аўтарства Заіра Азгура [6, с. 219]. У газеце «Літаратура і мастацтва» было надрукавана кароткае паведамленне: «Днямі ў гарадскім парку райцэнтра Свіслач адбылося ўрачыстае адкрыццё помніка вядомаму беларускаму рэвалюцыянеру-дэмакрату, кіраўніку сялянскага паўстання 1863 г. Кастусю Каліноўскаму.

У парку сабраліся жыхары райцэнтра, калгаснікі бліжэйшых вёсак. Урачысты мітынг адкрыў намеснік старшыні гарадскога Савета дэпутатаў працоўных тав. Клаўсуц. Затым выступілі дырэктар школы імя К. Каліноўскага тав. Куцяпалаў, старшыня калгаса «17 верасня» тав. Поўзікаў, вучаніца сярэдняй школы Тамара Сухоцкая. Яны гаварылі, што жыхары горада помняць свайго земляка.

Ападае пакрывала, перад позіркам прысутных на высокім пастаменце бюст Кастуся Каліноўскага» [11].

На 1963 г. прыпаў падвойны юбілей. З аднаго боку, 100-годдзе паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі, Польшчы і Літве, а з другога, – 125 гадоў з часу нараджэння К. Каліноўскага. Абедзве даты шырока адзначаліся ў БССР і адным галоўных месцаў, звязаных з адзначэннем «паўстанцкіх юбілееў», была Свіслаччына.

На пачатку лютага 1963 г. настаўнікі і вучні Грынкаўскай школы Свіслацкага раёна планавалі зрабіць лыжны паход па мясцінах К. Каліноўскага, наведаць Якушоўку і «месца бітвы паўстанцаў з царскімі войскамі» [4].

Пра юбілейныя ўрачыстасці, якія адбываліся ў Свіслацкім раёне, пісала рэспубліканская прэса. Тут цікава будзе разгледзець, як паказваліся гэтыя ўрачыстасці, якім ідэйным зместам былі напоўнены. Газета «Літаратура і мастацтва» ўжо ў другім нумары за 1963 г. пісала: «У гэтым годзе спаўняецца 100 гадоў з пачатку рэвалюцыйных падзей на Беларусі пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Гэты юбілей адзначаюць землякі рэвалюцыйнага дэмакрата – жыхары пасёлка Свіслач…» [3]. У канцы студзеня 1963 г. інфармацыю пра святкаванне «паўстанцкага юбілею» ў Свіслацкім раёне дала газета «Звязда», – орган ЦК КПБ, Вярхоўнага Савета і Савета міністраў БССР: «працоўныя Свіслацкага раёна адзначаюць 100-годдзе ўзброенага сялянскага паўстання на Беларусі пад кіраўніцтвам Кастуся Ка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліноўскага … Яшчэ летась вучні школы-інтэрната (у Свіслачы – *А. У.*) вырашылі стварыць музей свайго земляка. Яны наладзілі сувязі з музеямі Ленінграда, Гродна, Вільнюса, Варшавы, Кракава. У адрас школы прыходзілі цікавыя матэрыялы. Літоўскі дзяржаўны музей прыслаў копіі пратаколаў допыту Каліноўскага, былі атрыманы копія першай беларускай газеты «Мужыцкая праўда», якую выдаваў Каліноўскі, бюсты Кастуся Каліноўскага і яго сябра Валерыя Урублеўскага … У школе-інтэрнаце рыхтуецца вечар, прысвечаны барацьбе беларускага народа за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне» [2].

Да юбілею К. Каліноўскага ў Свіслацкай школе-інтэрнаце было зменена мастацкае афармленне музея, які носіць яго імя: «На сценах вісяць карціны беларускіх мастакоў Сергіевіча, Бараноўскага, Бугеля[2], якія адлюстроўваюць вобраз героя беларускага народа» [4]. Натуральна, што карціны вядомых мастакоў, нават іх рэпрадукцыі, маглі з’явіцца ў школьным музеі толькі пры спрыянні ўладаў.

Важнай формай адзначэння любога юбілею з’яўляюцца тэматычныя выставы. У студзені 1963 г. выставы «аб жыцці і рэвалюцыйнай дзейнасці Кастуся Каліноўскага» былі арганізаваныя ў Грынкаўскай школе Свіслацкага раёна і ў чытальнай зале Свіслацкага раённага дома культуры [2].

29–30 чэрвеня 1963 г. у Свіслачы, «на радзіме К. Каліноўскага», адбылася навуковая сесія, прысвечаная 100-годдзю паўстання 1863 г., арганізаваная Інстытутам гісторыі АН БССР і кафедрай гісторыі Гродзенскага педінстытута імя Янкі Купалы [1, с. 18]. У праграме былі заяўлены 4 навуковыя даклады. Сесію адкрыў прывітальным словам першы сакратар Гродзенскага сельскага абкама КПБ Уладзімір Міцкевіч [9]. З юбілейным дакладам пад назвай «Стагоддзе са дня паўстання 1863 г.» выступіла старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР С. Байкова. Пасля гэтага прагучаў даклад вучонага сакратара Інстытута гісторыі Літоўскай ССР Магельёна Зараўскайтэ «Паўстанне 1863 г. на тэрыторыі Літвы». Быў агучаны таксама даклад студэнта 5 курса Гродзенскага педінстытута (зараз акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Міхаіла Касцюка «Удзел сялян Слонімшчыны ў паўстанні 1863 года». Апошнім з навукоўцаў выступіў старшы навуковы супра-

[2] Відавочна меўся на ўвазе мастак Адольф Гугель. – *А. У.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цоўнік Інстытута гісторыі АН СССР А. Смірноў з дакладам «К. Каліноўскі ў ацэнцы гістарычнай навукі». Завяршыла навуковую сесію выступленне камандзіра «партызанскага злучэння імя К. Каліноўскага» Мікалая Вайцяхоўскага [9].

На 1988 г. выпаў 150-гадовы юбілей К. Каліноўскага. Да гэтай даты было прадугледжана спецыяльнай пастановай ЦК КПБ ажыццяўленне шэрага мерапрыемстваў.

Акадэмія навук БССР і Міністэрства культуры БССР павінны былі правесці юбілейную сесію Аддзялення грамадскіх навук АН БССР і апублікаваць яе матэрыялы ў «Весцях Акадэміі навук Беларускай ССР».

Міністэрству культуры БССР, Свіслацкім райкаму КП Беларусі і выканкаму раённага Савета народных дэпутатаў даручалася:

– усталяваць у вёсцы Якушоўка Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці мемарыяльную дошку на доме, у якім жыла сям'я К. Каліноўскага;

– рэстаўраваць будынак былой Свіслацкай гімназіі, дзе вучыўся К. Каліноўскі;

– рэстаўраваць помнік К. Каліноўскаму ў гарадскім пасёлку Свіслач;

– абнавіць экспазіцыю аб жыцці і дзейнасці К. Каліноўскага ў Свіслацкім гісторыка-краязнаўчым музеі.

Неабходна адзначыць, што большая частка выкладзеных у партыйнай пастанове прапаноў былі рэалізаваны ў жыццё. Святкаванне 150-годдзя з дня нараджэння К. Каліноўскага атрымала шырокі грамадскі рэзананс у рэспубліцы. Так, ужо 30 кастрычніка 1987 г. Пастановаю Савета Міністраў БССР Свіслацкай сярэдняй школе № 1 было прысвоена імя К. Каліноўскага. У Свіслацкім раёне была створана адмысловая камісія, якая разгарнула актыўную работу. У рамках выканання запланаваных камісіяй мерапрыемстваў вучнямі Свіслацкіх школ і Грынкаўскай школы была пасаджана алея ліп. Па памятных мясцінах Свіслаччыны, звязаных з імем Каліноўскага, на месцы дзейнасці паўстанцкіх атрадаў і распаўсюджвання «Мужыцкай праўды», была праведзена эстафета юных турыстаў, удзел у якой прынялі каманды ўсіх сярэдніх школ раёна. Фотакарэспандэнт Ч. Горбач стварыў аматарскі кінафільм, у якім былі адлюстраваны памятныя мясціны, звязаныя з жыццём

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і дзейнасцю К. Каліноўскага. Да 150-годдзя з дня нараджэння К. Каліноўскага быў выпушчаны плакат «Навечна ў памяці народнай», падрыхтаваны супрацоўнікамі Свіслацкага раённага гісторыка-краязнаўчага музея, рэдакцыяй раённай газеты «Заветы Ильича» і раённым саветам Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Свіслацкай раённай бібліятэкай і рэдакцыяй раённай газеты была праведзена гістарычная віктарына, прысвечаная жыццю і дзейнасці славутага земляка. У школах раёна вучні пісалі сачыненні на тэму «Наш славуты зямляк Кастусь Каліноўскі». Вытрымкі з якіх былі надрукаваныя ў свіслацкай раённай газеце. На шклозаводзе «Нёман» былі выраблены сувеніры з партрэтам К. Каліноўскага [8, с. 71].

29–30 студзеня 1988 г. у г. Гродне і Свіслацкім раёне была праведзена рэспубліканская навуковая канферэнцыя, прысвечаная «150-годдзю выдатнага рэвалюцыянера-дэмакрата і мысліцеля Кастуся Каліноўскага і 125-годдзю паўстання 1863–1864 гадоў у Беларусі і Літве» [8, с. 72].

125-годдзе з дня смерці К. Каліноўскага – апошні яго юбілей, адзначаны ў БССР. Гісторык, прафесар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Міхась Ткачоў пісаў у газеце «Чырвоная змена»: «125 гадоў таму назад абарвалася жыццё незаменнага сына Беларусі, яе абаронцы і вешчуна свабоды прыгнечанага народа Кастуся Каліноўскага» [13]. Артыкул быў напісаны даволі жыва, нават эмацыйна: «Мы, сённяшнія нашчадкі Каліноўскага, моцна трымаем у памяці яго заклікі да волі, да працы, да навукі. Памятаем і зробім усё, каб і дзеці нашы не забылі, якой цаной куплена свабода народа». Таксама М. Ткачоў пісаў пра археалагічныя раскопкі, якія рабілі супрацоўнікі і студэнты Гродзенскага ўніверсітэта на месцы дома Каліноўскіх у вёсцы Якушоўка, дзе быў «сабраны вялікі матэрыял, на падставе якога будзе адноўлены дом-сядзіба К. Каліноўскага, у якім размесціцца музей. Хутка пачнецца яго будаўніцтва».

Што тычыцца будаўніцтва дома-музея, то гэта рашэнне, як і іншыя пастановы, датычныя ўвекавечання памяці К. Каліноўскага, было прынята Бюро ЦК КПБ 21 красавіка 1989 г.: «У мэтах увекавечання памяці рэвалюцыянера-дэмакрата Кастуся Каліноўскага… Бюро ЦК Кампартыі Беларусі пастанаўляе… Прыняць прапановы Гродзенскага абкама КПБ, Міністэрства культуры БССР, Беларускага рэспубліканскага аддзялення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Савецкага фонду культуры: аб усталяванні ў г. Гродна помніка Кастусю Каліноўскаму; аб стварэнні ў 1989–1992 гадах музея у в. Якушоўка Свіслацкага раёна, дзе Кастусь Каліноўскі правёў дзіцячыя гады» [10, а. 7].

Такім чынам, можна адназначна канстатаваць, што Свіслаччына ў 1958–1989 гг. была рэспубліканскім цэнтрам ушанавання памяці К. Каліноўскага. Гэтая акалічнасць можа быць прыкладам і для сённяшняга пакалення жыхароў Свіслацкага краю, тым больш, што набліжаецца 180-гадовы юбілей з часу нараджэння К. Каліноўскага, які прыпадае на 2018 г. Усталяванне помнікаў, памятных знакаў, стварэнне першага ў Беларусі музея К. Каліноўскага можа стаць той адметнасцю Свіслаччыны, якая будзе прыцягваць увагу жыхароў усёй краіны і замежжа, садзейнічаць развіццю гістарычнага турызму павелічэнню вядомасці Свіслацкага раёна.

---

1. *Белы, А.* Вобраз К. Каліноўскага ў літаратуры і мастацтве / А. Белы. – Мінск, 1988. – С. 18.

2. *Вайкуль, А.* На радзіме Кастуся Каліноўскага / А. Вайкуль // Звязда. – 1963. – 29 студзеня. – № 24. – С. 4.

3. *Вайкуль, А.* На радзіме Кастуся Каліноўскага / А. Вайкуль // Літаратура і мастацтва. – 1963. – 4 студзеня. – № 2. – С. 3.

4. *Вайкуль, А.* На родине Кастуся Калиновского / А. Вайкуль // Гродненская правда. – 1963. – 2 февраля. – № 24. – С. 4.

5. *Зімёнка, А.* Заходняму брату. Памяці К. Каліноўскага / А. Зімёнка // Полымя. – 1924. – № 2. – С. 20–21.

6. *Кісялёў, Г. В.* З думай пра Беларусь / Г. В. Кісялёў. – Мінск : Беларусь, 1966. – 320 с.

7. *Клаз, І.* Змагар за шчасце народа / І. Клаз // Літаратура і мастацтва. – 1958. – 22 студзеня. – № 7. – С. 2–3.

8. *Мазец, В. Г.* З нагоды слаўнага юбілею, або як адзначалася ў БССР 150-годдзе з дня нараджэння Кастуся Каліноўскага і 125-годдзе паўстання 1863–1864 гг. / В. Г. Мазец // Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі, Літве і Украіне: гісторыя і памяць : зб. навук. арт. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 427 с.

9. Научная сессия на родине К. Калиновского // Советская Белоруссия. – 1963. – 4 июля. – № 155. – С. 2.

*10.* Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4. Воп. 160. Спр. 939 (матэрыял атрыманы ад В. Г. Мазеца).

*11.* Помнік К. Каліноўскаму // Літаратура і мастацтва. – 1958. – 15 лістапада. – № 91. – С. 2.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12.* Спадчына акадэміка Яўхіма Карскага. Да 150-годдзя з дня нараджэння [Электронны рэсурс] / склад. : В. У. Скалабан, К. В. Суша ; пад агульнай рэд. Р. С. Матульскага [і інш.]. – Мінск : НББ, 2010. – 1 электр. апт. дыск (CD-ROM).

*13. Ткачоў, М.* Не згасне справа Каліноўскага / М. Ткачоў // Чырвоная змена. – 1989. – № 57. – 25 сакавіка. – С. 7.

*14. Цьвікевіч, І.* Кастусь Каліноўскі (к 60-годзьдзю яго сьмерці) : Біяграфічна-гістарычны нарыс / І. Цьвікевіч // Полымя. – 1924. – № 2. – С. 3–18.

В. І. ЯКАЎЧУК

## ДЗЕЙНАСЦЬ ОРГАНАЎ МЯСЦОВАГА КІРАВАННЯ ПА АДНАЎЛЕННІ МІРНАГА ЖЫЦЦЯ Ў СВІСЛАЦКІМ РАЁНЕ (1944–1950 гг.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У ліпені 1944 г. тэрыторыя Беларусі вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У выніку Беластоцкай аперацыі 17 ліпеня г. п. Свіслач быў ачышчаны ад ворага войскамі 2-га Беларускага фронту пад камандаваннем генерал-палкоўніка Г. Ф. Захарава. Першымі ў Свіслач увайшлі воіны 190-га стралковага палка 5-й стралковай Арлоўскай Чырвонасцяжнай ордэнаў Суворава і Кутузава дывізіі (камандзір палкоўнік Н. Т. Міхаліцын), якія і ўзнялі чырвоны сцяг над зруйнаваным пасёлкам [5, с. 248–250].

За гады вайны ў БССР было разбурана або вывезена ў Германію 10 338 прамысловых прадпрыемстваў. Агульныя страты, нанесеныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі дзяржаўнай прамысловасці Беларусі, склалі 6225 млн руб. (у цэнах 1941 г.). Ворагі спалілі і разбурылі больш за 200 гарадоў і райцэнтраў. Матэрыяльны ўрон, нанесены сельскай гаспадарцы рэспублікі, склаў 22 471,9 млн руб. Агульны матэрыяльны ўрон, нанесены фашыстамі эканоміцы і насельніцтву Беларусі, дасягнуў 75 млрд руб., што ў 35 разоў перавысіла дзяржбюджэт рэспублікі ў 1940 г. [3]. Але самай вялікай стратай было масавае знішчэнне насельніцтва. Больш за 2,2 млн чалавек знішчылі акупанты на тэрыторыі Беларусі, каля 380 тыс. жыхароў Беларусі вывезлі на катаргу ў Германію. У выніку колькасць рабочых